# УКЛАД СУПРАЦОЎНІКАЎ БДМУ У ЗАХАВАННЕ ПАМЯЦІ АБ ГЕРАІЗМЕ МЕДЫКАЎ У ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ

Поляк Н.А.
к.и.н., доцент кафедры философии и политологии с курсом повышения квалификации и переподготовки
УО «Белорусский государственный медицинский университет»

**Актуальнасць.** Вялікая Айчынная вайна пакінула незгладжальны адбітак у гісторыі Беларусі. Яна стала для нашага норода «вечнай». Тыя трагічныя падзеі адлюстраваны ў многіх навуковых працах і публіцыстычных выданнях. Пэўнае месца ў іх адведзена геразму медыцынскіх работнікаў, якія дапамагалі на фронце і ў тыле ворага. Сярод іх былі супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта – тады Мінскага медыцынскага інстытцра. Аднавіць імёны суайчыннікаў і калег, якія рызыкавалі жыццём у гады вайны – было і ёсць першаснай задачай для БДМУ на сучасным этапе.

Тэма актуальная і значная таму, што супрацоўнікамі нашага ўніверсітэта сапраўды зроблена і робіцца шмат для захавання памяці, аднаўлення імёнаў герояў, але ніколі гэта тэма не вывучалася падрабязна. Настаў момант падвесці вынік, абагульніць дасягнутыя рэзультаты і ацаніць значэнне зробленага для маладога пакалення студэнтаў-медыкаў, настаўнікаў-урачоў і тых, хто займе іх месцы ў будучым.

**Асноўныя палажэнні даследавання:** Вывучэнне гэтай тэмы мае вялікую значнасць у сувязі з тым, што увекавечванне памяці пра Вялікую Айчынную вайну і падтрыманне гістарычнай праўды, дапамагае прадухіліць скажэнне фактаў. Шматлікія даследаванні, публікацыі, запісы ўспамінаў будучым пакаленням робяць магчымым перадачу рэальных звесткак пра геразм урачоў у выкананні свайго прафесійнага абавязку.

Збор інфармацыі, навуковы пошук, размовы са сведкамі падзей, якія вяліся не адно дзесяцігоддзе студэнтамі, выкладчыкамі, карэспандэнтамі часопісаў і газет БДМУ маюць вялікае сацыяльнае значэнне таму, што памяць пра вайну з'яўляецца важнай часткай нацыянальнай ідэнтычнасці і аб’ядноўвае грамадства вакол агульных каштоўнасцей і гісторыі. Супрацоўнікі БДМУ сваім прыкладам паказваюць важнасць павагі да мінулага і да працы сваіх калег.

Намаганні па захаванню памяці прыкладаліся супрацоўнікамі Мінскага медыцынскага інстытута, адразу пасля вяртання ўстановы з эвакуацыі горада Яраслаўля. Інстытут у кастрычніку месяцы распачаў навучальны год і студэнтаў у ім было больш чым у іншых ВНУ г. Мінска. Публікацыя артыкулаў з успамінамі пачалася на старонках газеты “Савецкі медык” (сёння Веснік БДМУ). Амаль у кожным нумары карэспандэнты, якімі часам былі самі студэнты друкавалі матэрыялы сустрэч з выкладчыкамі-удзельнікамі баявых дзеянняў на франтах і з тымі,

хто змагаўся ў партызанскіх атрадах. Гэта былі сустрэчы, размовы, пытанні, дзе суразмоўцы расказвалі пра сваё жыццё і працу падчас акупацыі або на перадавой. Сёння з гэтымі ўспамінамі можна пазнаёміцца ва ўніверсітэцкай бібліятэке, дзе захоўваюцца амаль усе нумары «Савецкага медыка».

На працягу 80 год амаль на кожнай кафедры нашага ўніверсітэта працавалі людзі, якія не маглі абмінуць падзеі 1941-1944 гг. Яны з натхненнем збіралі інфармацыю, фотаздымкі, асабістыя рэчы сваіх калег-ветаранаў. З цягам часу фарміраваліся, нават навукова-творчыя калектывы, якія арганізоўвалі гістарычны пошук, друкавалі вынікі сваіх даследаванняў. Але бадай самае значнае, што ніколі не забывалі саміх ветеранаў. Наведвалі, віншавалі, дзякавалі, дапамагалі па жыццёвым справам і запісвалі ўспаміны.

Эпагеем такой працы стала выданне ў 2024 г. ва ўніверсітэце манументальнай кнігі «А памяць бессмяротная ...». Калектыўная манаграфія стала вынікам шматгадовых намаганняў захаваць каштоўныя звесткі аб медыках героях, супрацоўніках БДМУ. Кніга прысвечана настаўнікам і супрацоўнікам універсітэта, якія сталі ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны.

Аўтарамі кнігі з'яўляюцца: рэктар БДМУ член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар медыцынскіх навук, прафесар Сяргей Рубніковіч, загадчык музея БДМУ Мікалай Шумін, дацэнт кафедры марфалогіі чалавечай, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт Уладзімір Манулік, дацэнт кафедры сківічна-тварнай і пластычнай хірургіі чалавека, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт Валянціна Маргунская.

Трэба адзначыць, што кніга «А памяць бессмяротная ...» не толькі ўвекавечвае памяць аб гераізме ветэранаў-супрацоўнікаў БДМУ, але і служыць важным адукацыйна-выхаваўчым інструментам. Змест манаграфіі дапамагае маладому пакаленню зразумець значэнне гісторыі, вучыць, шанаваць старэйшае пакаленне, паважаць прадстаўнікоў прафесіі, якія не спыняліся ні перад якімі цяжкасцямі.

Адзін з аўтараў манаграфіі загадчык музея гісторыі БДМУ Мікалай Сяргеевіч Шумін паведаміў, што “...тэма Вялікай Айчыннай вайны для нашага ўніверсітэта з’яўляецца ключавой. Гэта было ўлічана пры стварэнні, па ініцыятыве рэктарата ўніверсітэта ў 2021 г. С. Рубніковаіча, музея ўніверсітэта. Музейная справа патрабуе дасканалых падыходаў у дакументіраванні, архівіраванні і аднаўленні арціфактаў. Іх у нашым музеі немала. Ва універсітэце працуюць людзі, якія ўжо ў некалькіх пакаленнях выкладчыкі медыцынскай ВНУ і ўрачы. У хатніх калекцыях такіх людзей шмат артыфактаў. Кожны жадае падзяліцца часткай гісторыі сваёй сям’і з моладдзю і з задавальненнем прыносяць рэчы ў наш музей. .... Нездарма экскурсійныя лекцыя і экспазіцыі пра падзеі вайны выклікаюць

найбольшы інтарэс у наведвальнікаў. Прыходзіца шмат працаваць каб зрабіць выставу цікавай і візуальна наблізіць тую эпоху да гледачоў. Выданне кнігі наспявала даўно і Сяргей Пятровіч Рубнікові іініцыіраваў яе падрыхтоўку, стаўшы начале аўтарскага калектыва».

Манаграфія ўтрымлівае біяграфічныя звесткі 262 ветаранаў Вялікай Айяыннай вайны – рэктараў, загадчыкаў кафедр, выкладчыкаў, асісцентаў, інспектароў па кадрах, загадчыкаў метадычных кабінетаў, лабарантаў, ліфцёраў, камендантаў, пашпарцістаў і іншых супрацоўнікаў Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута. У кнізе ўзгадваецца больш за 53 кафедры і структурныя адзінкі МДМІ/БДМУ. На старонках выдання размешчаны рэдкія дакументы і фотаздымкі з фондаў музеяў і архіваў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, а так сама з сямейных архіваў блізкіх ветэранам людзей. Каляровыя здымкі пасведчанняў, лісты ўзнагарод, асабістыя кніжкі ўдзельнікаў аднаўлення Мінска, баявыя характарыстыкі, камандзіровачныя пасведчанні, здымкі з баявымі таварышамі і шмат іншых каштоўных дакументаў сабраны ў выданні. Найбольш карыснымі для патрыятычнага выхавання, на наш погляд, з'яўляюцца асабістыя ўспаміны ветеранаў, пепіска з роднымі. У некалькіх радках адлюстраваны перажыванні, цяжар ваеннага ліхалецця і аб'ектыўнае бачанне таго, што адбывалася на самой справе.

Размешчаная ў выданні інфармацыя дазваляе нам паглыбіцца ў эпоху, зразумець яе маштаб праз людзей, якія ўнеслі значны ўклад у перамогу ў медыцынскую справу, у медыцынскую адукацыю. Сабраны матэрыял дае аснову для аналізу культурнай значнасці пошуковых работ супрацоўнікамі БДМУ для ўспрымання грамадскасцю падзей вайны. Стварэнне музея і падрыхтоўка манаграфіі дапамагаюць абараць гісторыю нашай краіны для наступных пакаленняў.

Захаванне памяці аб вайне і гераізме ўрачоў, якая ўвасобілася ў стварэнні музея і напісанні манаграфіі, з'яўляюцца важнай часткай навучальнага працэсу. Памяць аб гераічнысм мінулым накіравана на фарміраванне патрыятычных каштоўнасцей, павагі да гісторыі і калег-медыкаў. На сёняшні дзень кніга «А памяць бессмяротная…» актыўна выкарыстоўвацца для падрыхтоўкі семінарскіх заняткаў, круглых сталоў, канферэнцый. Біяграфіі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, сабраныя ў ёй, дапамагаюць студэнтам пазнаёмяцца з подзвігам супрацоўнікаў БДМУ і ўсвядоміць значэнне вернасці прафесіі ў дасягненні Перамогі і свабоды для Радзімы.

Апісаныя ў выданні падзеі дазваляюць арганізоўваць тэматычныя мерапрыемствы. Напрыклад, памятныя вечары, выставы, канцэрты, сустрэчы са сваякамі ветеранаў. На такіх мерапрыемствах студэнты могуць пачуць запісаныя ўспаміны відавочцаў і пазнаёміцца з архіўнымі матэрыяламі. Біяграфічныя звесткі дазваляюць маладому пакаленню чуць

гісторыі пра вайну з першых вуснаў, мецъ аб'ектыўнае ўяленне аб тых падзеях і супрастаяць фальсіфікацыі.

Дзякуючы праведзенай працы па захаванню памяці аб вайне, маладое пакаленне студэнтаў-медыкаў далучаецца да правядзення мемарыяльнай работы. Удзел у мемарыяльных мерапрыемствах, ускладанне кветкак да помнікаў, далучэнне да акцый памяці, правядзенне рэквіямаў, дапамагае студэнскай моладзі больш глыбока прасякнуцца духам патрыятызма.

У манаграфіі абазначана мноства тэм, якія могуць стаць заглаўнымі ў далейшай даследчай працы. Студэнты маюць магчымасць удзельнічаць у навуковых праектах, прысвечаных гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Гэта ўключае ў сябе працу з архіўнымі дакументамі, апытанне ветэранаў, пошук імён іншых герояў. Спіс ветеранаў-урачоў можа быць дапоўнены спісам студэнтаў БДМУ, якія гераічна змагаліся за Перамогу.

Праведзеная нашымі папярэднікамі работа безумоўна каштоўная, але яе вынікі павінны быць максімальная папулярызаваны. Так, напрыклад, на дапамогу могуць прыйсці даступныя сёння маладому пакаленню электронныя тэхналогіі. Стварэнне віртуальных экскурсій, інтэрактыўных выстаў, выкарыстанне сацыяльных сетак дапамогуць адукацыйна-выхаваўчай працы. Пашырэнне метадаў пашуковай работы дапамогуць прыцягнуць увагу шырокай аўдыторыі да важных тэм, натхніць маладое пакаленне да працяга захавання памяці пра подзвіг супрацоўнікаў БДМУ ў Вялікай Айчыннай вайне.

**Выснова:** Супрацоўнікі МДМІ/БДМУ ўнеслі значны ўклад у захаванне памяці аб гераізме медыкаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Збіранне інфармацыі аб урачах героях пачалося адразу пасля заканчэння вайны і працягваецца па сёняшні дзень. Знакавай падзеяй у такой рабоце стала выданне манаграфіі «А памяць бесмяротная ...». Супрацоўнікі ўніверсітэта за 80 год зрабілі шмат каб гераізм іх калег застаўся ў памяці. Дзякуючы папулярызацыі звестак аб асабістым лёсе ветеранаў моладзь загартоўвае патрыятызм і ўмацоўвае гатоўнасць абараняць Радзіму. Захаванне памяці аб вайне мае вялікае значэнне ў адукацыйнай, навуковай і выхаваўчай рабоце са студэнтамі-медыкамі зараз і ў будучым.

## Літаратура

1. Советский медик 1964 г. №4 15-18 марта
2. А память бессмертна …: биографии преподавателей Белорусского государственного медицинского университета – ветеранов Великой Отечественной войны / С.П. Рубникович [и др.]. – Минск: БГМУ, 2024. – 472 с.